DC COMICS
THE NEW 52!
4
$2.99
US
FRANCIS
MANAPUL
The FLASH
BRIAN
BUCCELLATO
.BY
COMICS
КОМІКСЫ ПА-БЕЛАРУСКУ
ФЛЭШ
#4 (2011)
ПЕРАКЛАД:
АРТУР БАРАДАЧОЎ
АФАРМЛЕННЕ:
СЯРГЕЙ КОЗЫРАЎ
TOO MUCH TOO FAST!
2011


DC COMICS
THE NEW 52!
4
$2.99 US
The FLASH
STOPPED... DEAD!
DIRECT SALES
RATED T TEEN
FRANCIS MANAPUL
BRIAN BUCCELLATO
FEB 2012


«ЦЁМНЫЯ ЧАСЫ МОГУЦЬ ПАЛАЖЫЦЬ ПАЧАТАК НЕЗВЫЧАЙНАМУ».
«АЗІРАЕШСЯ НАЗАД, ПРЫГАДВАЮЧЫ ГЭТЫЯ ПЭЎНЫЯ МОМАНТЫ, І КАЖАШ...»
«...ВОСЬ, КАЛІ ЎСЁ ЗМЯНІЛАСЯ».
«ВОСЬ, ДЗЕ ЎСЁ ПАЧАЛОСЯ».
«МЫ БЫЛІ НАРО-ДЖАНЫ ПАД ПО-КРЫВАМ СМЕРЦІ».
«І ПРАЗ ЯГОНЫ БОЛЬ МЫ ЗНАЙШЛІ СВАЁ ПРЫЗНА-ЧЭННЕ, МЫ ЗНАЙШЛІ, У ШТО ВЕРЫЦЬ».
«ПАКУЛЬ ЁН НЕ ПАКІНУЎ НАС».
«І МЫ ЗНІКЛІ».
ДЗЯКУЙ, ШТО ПРЫЙШОЎ.

ДЗЕ МНЕ ЯШЧЭ БЫЦЬ, ЦІТА? ВЫ ДЛЯ МЯНЕ ЯК СЯМ'Я.
ТЫ ДОБРЫ ХЛОПЕЦ, БАРЫ. КАЛІ Б ТОЛЬКІ МАНУЭЛЬ...
МЯРКУЮ, У ЯГО ЁСЦЬ ПРЫЧЫНЫ АДСУТНІЧАЦЬ ТУТ.
МЭНІ ВЕЛЬМІ ПАДОБНЫ НА СВАЙГО БАЦЬКУ.
ЁН НЯ МОЖА СЯДЗЕЦЬ НА АДНЫМ МЕСЦЫ.
ЁН НЕ ЖАДАЕ ПУСКАЦЬ КАРАНІ.
ТЫ ПРАПУСЦІЎ ШМАТ НАДЗВЫЧАЙ ДОБРЫХ СЛОВАЎ, ТВАЯ МАЦІ...
Я НАВАТ НЕ МАГУ ПАГЛЯДЗЕЦЬ НА ЯЕ... ТАМУ ШТО БАЧУ ТОЛЬКІ ТОЕ, ШТО ЯНА ЗРАБІЛА З БАЦЬКАМ. АМАЛЬ ВЫГНАЛА ЯГО ЗА ДЗВЕРЫ. КАЛІ Б ЯНА НЕ ДАЛА ЯМУ ТЫЯ ПАПЕРЫ, ЁН НІКОЛІ Б НЕ ПАЛЯЦЕЎ НА ТЫМ САМАЛЁЦЕ.
ГЭТА НЕСПРАВЯДЛІВА.
НЕСПРАВЯДЛІВА, ГЭТА ТОЕ, ШТО ЗДАРЫЛАСЯ З БАЦЬКАМ. ДЗЁЎБАНЫЯ ТЭРАРЫСТЫ. НІБЫ НЕЙКІ ЖОРСТКІ ЖАРТ.
А Я ЗРАБІЎ СВОЙ. Я ЗАБ'Ю ЎСІХ, ХТО АДКАЗНЫ ЗА ЯГОНУЮ СМЕРЦЬ.
ТВАЯ МАЦІ НЕ МАГЛА ВЕДАЦЬ, ШТО ТАК ЗДАРЫЦЦА. ТВОЙ ТАТА САМ ВЫРАШЫЎ СЕСЦІ Ў ТОЙ САМАЛЁТ. ГЭТА БЫЎ ЯГОНЫ ВЫБАР.
ТЫ Ж НЕСУР'ЁЗНА, МАНУЭЛЬ?
Я ВЕЛЬМІ СУР'ЁЗНА. Я ПРАЙШОЎ АДБОР. МЯНЕ ЎЗЯЛІ. ЦРУ ЗАЎСЁДЫ МОГУЦЬ СПАТРЭБІЦЦА ТАКІЯ ХЛОПЦЫ, ЯК ТЫ.
Я НЕ МАГУ. ТЫ Ж МЯНЕ ВЕДАЕШ. Я ВУЧОНЫ, А НЕ ГЕРОЙ.
НЕ НЕДААЦЭНЬВАЙ СЯБЕ, БАРЫ. ТАБЕ ТРЭБА ЗНАЙСЦІ ШТОСЬЦІ ЗНАЧНАЕ І ТРЫМАЦЦА ЗА ГЭТА. ДЛЯ МЯНЕ – ГЭТА ЗНАЙСЦІ ЗАБОЙЦАЎ МАЙГО БАЦЬКІ.
ЧАС І ТАБЕ ВЫБІРАЦЬ.
«БЕЗ ЯГО МЫ ПРАПАДАЕМ, АЛЕ ЦЯПЕР У НАС ЁСЦЬ МЭТА, ДОКТАР ЭЛІАС...»


НЕЎРАДЛІВЫЯ ЗЕМЛІ.
ПА-ЗА МЕЖАМІ ЦЭНТРАЛ-СІЦІ І КЕЙСТОЎНА.
...ЖЫЦЦЁ. МЫ ЖАДАЕМ ЖЫЦЬ.
ЯК І ЎСЕ МЫ, ТАК ЖА?
ТАК, АЛЕ... ВОСЬ ТУТ ВЫ І СПАТРЭБІЦЕСЯ. НАТОЎПУ НЕАБХОДНА ВАША ДАПАМОГА, ДОК.
І МОЙ ПЕРАКАДЗІРОЎШЧЫК ГЕНОМА, КАЛІ Я ПРАВІЛЬНА РАЗУМЕЮ.
ЁН У НАС ЁСЦЬ. А ЦЯПЕР І ВЫ.
ШТОСЬЦІ НЯ ТАК З НАШАЙ ДНК. З-ЗА ГЭТАГА МЫ ПАМІРАЕМ, ПРАЖЫЎШЫ ТОЛЬКІ ПАРУ МЕСЯЦАЎ.
І ВЫ НЕАБХОДНЫ НАМ, КАБ ГЭТА ВЫПРАВІЦЬ.
З-ЗА ГЭТАГА ЭЛЕКТРАМАГНІТНАГА ІМПУЛЬСУ, ЯКІ АБЯСТОЧЫЎ ЦЭНТРАЛ-СІЦІ, МАЯ ЛАБАРАТОРЫЯ БЕСКАРЫСНАЯ*.
*НЕВЫТЛУМАЧАЛЬНЫ ЭЛЕКТРАМАГНІТНЫ ІМПУЛЬС, ЯКІ АБУРЫЎСЯ НА ГОРАД У 2-ІМ НУМАРЫ, ПАЗБАВІЎ ЭНЕРГІІ ЦЭНТРАЛ-СІЦІ І КЕЙСТОЎН.
У МЯНЕ ЁСЦЬ ЭКСПЕРЫМЕНТАЛЬНАЯ КРЫНІЦА ЭНЕРГІІ, АЛЕ ЯНА ЯШЧЭ НЕ НЯ ВЫПРАБАВАНАЯ.
САМЫ ЧАС ВЫПРАБАВАЦЬ, ДОК.
ДОБРА, ПАВЕДАМІЦЕ МНЕ ПРА ВАШАГА «БАЦЬКУ»...
...І ЯК ВЫ ЎЗНІКЛІ.
МЫ ПАЙШЛІ АД МАНУЭЛЯ ЛАГО...





«ЁН БЫЎ АГЕНТАМ ЗША ПАД ПРЫКРЫЦЦЁМ. ЯМУ ЎКАРАНІЛІ ЗДОЛЬНАСЦІ ДА РЭГЕНЕРАЦЫІ. ГЭТА БЫЛА ЧАСТКА СУПЕР-САКРЭТНАГА ЎРАДАВАГА ПРАЕКТА».
«ЁН І ТАК УЖО БЫЎ ДОБРА НАТРЭНІРАВАНЫМ ФАЙНЫМ ХЛОПЦАМ, АЛЕ ДЗЯКУЮЧЫ РЭГЕНЕРАЦЫІ, ШТО АБАРАНЯЛА АД УСЯЛЯКІХ ПАШКОДЖАННЯЎ, ЁН СТАЎ НАЙЛЕПШЫМ».
«ПРОСТА ВЫЗНАЧЦЕ ЯМУ НЕАБХОДНЫ НАКІРУНАК І САЧЫЦЕ ЗА ЯГОНАЙ ПРАЦАЙ».
«ДЖЭЙМ БОНД ПЛЮС БЭТМЭН».
«АЛЕ ЁН ТОЛЬКІ ЧАКАЎ СВОЙ ЧАС, ЗБІРАЎ ІНФАРМАЦЫЮ».
«І ЯК ТОЛЬКІ ЁН ДАВЕДАЎСЯ ІМЁНЫ ЗАБОЙЦАЎ СВАЙГО БАЦЬКІ, ЁН СЫШОЎ У САМАВОЛКУ».
«ЯНЫ НАЗЫВАЛІ СЯБЕ «ВАСІЛІСК»*.
«АЛЕ ДЛЯ ЯГО ЯНЫ БЫЛІ МЕРЦВЯКАМІ».
*«ВЫ ДАВЕДАЕЦЕСЯ ПРА ВАСІЛІСКА З КОМІКСА АТРАД САМАГУБЦАЎ НУМАР Ч!»
DC COMICS PROUDLY PRESENTS THE FLASH IN MOB RULE
STORY BY FRANCIS MANAPUL & BRIAN BUCCELLATO
ART AND COVER BY FRANCIS MANAPUL
ШЧЫРЫ ДЗЯКУЙ ЗА ПАДТРЫМКУ COMICSBY.BY: Сяргей Лісічонак
DC COMICS З ГОРДАСЦЮ ПРАДСТАЎЛЯЕ ФЛЭШ Ў СЮЖЭЦЕ «НАТОЎП»
COLORS BRIAN BUCCELLATO
LETTERS CARLOS M. MANGUAL
VARIANT COVER ERIC BASALDUA WITH NEI RUFFINO
ASSISTANT EDITOR DARREN SHAN
EDITOR BRIAN CUNNINGHAM
ТРАПІЎШЫ ПАД УДАР МАЛАНКІ І ПАДПАЎШЫ ПАД УПЛЫЎ ХІМІКАТАЎ, ПАЛІЦЭЙСКІ КРЫМІНАЛІСТ БАРЫ АЛЕН ПЕРАТВАРЫЎСЯ Ў САМАГА ХУТКАГА ЧАЛАВЕКА НА СВЕЦЕ. ЁН ВЫКАРЫСТОЎВАЕ ЭНЕРГЕТЫЧНАЕ ПОЛЕ СПІДФОРС ДЛЯ ДАСЯГНЕННЯ СПРАВЯДЛІВАСЦІ І АБАРОНЫ І СЛУЖЫЦЬ СВЕТУ ЯК ФЛЭШ!


«Ён забіваў іх аднаго за адным».
«Але якім бы файным ён ня быў...»
«...ён быў усяго толькі **адным чалавекам**.»
«Зразумела, у яго былі дапаможцы, яны пачалі **катаваць** яго».
«Яны пачалі з пальцаў, потым перайшлі да рук».
«Калі яны даведаліся, што ён можа рэгенерыравацца, яны сталі рэзаць зноў».
«І зноў».
«І зноў».
«Яны катавалі яго некалькі тыдняў, якія былі для Мануэля **вечнасцю**. Ён быў гатовы здацца. Ён жадаў памерці».
«Але нешта ўнутры яго не было згодна з такім канцом».
«А калі ягонае цела вырашыла, што ён здаўся...»
«Мы рэгенерыравалі з ягоных адсечаных канечнасцяў».
«У нас былі агульныя ўспаміны і агульная **псіхічная сувязь**, але таксама ў нас былі і свае думкі і асобы. Мы маглі рэгенерыраваць таксама як і ён, але мы не маглі ствараць жыццё».
«Замест гэтага мы былі злучаныя адзін з адным... сталі часткамі **вялікага цэлага**».
«Але ўсё ж **ягонымі** часткамі».
«Таму мы выратавалі свайго стваральніка».



«Разам мы раздавілі шмат ворагаў. Ён быў ня проста выключным лідарам».
«Ён быў нашым бацькам».
«А потым мы пачалі паміраць».
«Паміраць з невялікай розніцай, у парадку свайго стварэння».
«Мы ня ведалі чаму, але зразумелі, што ключ да нашага выжывання схаваны ў Мануэле».
«Замест таго, каб дапамачы нам, ён уцёк».
«Ён пакінуў нас паміраць».
Прабачце, я паспрабую зрабіць усё магчымае, каб дапамагчы вам.
У мяне ёсць магчымасць адраманта-ваць гэты апарат у маёй лабараторыі. Тут я не магу даць аніякіх гарантый, я паспрабую зарадзіць яго з дапамогай сваёй эксперыментальнай крыніцы энергіі.
Але каб ён дзейнічаў, нам неабходны эта-лон ДНК, каб перапісаць ваш генетычны код. Нам спатрэбіцца арыгінальная крыніца.
Нам патрэбны Мануэль.
Мы над гэтым працуем...


МОСТ ГЕМ-СІЦІЗ
ПРАБАЧЦЕ, ЛЮДЗІ!
МНЕ ТРЭБА, КАБ ВЫ АДЫЙШЛІ! ВЕЛЬМІ НЕБЯСПЕЧНА ПУСКАЦЬ ЛЮДЗЕЙ НА МОСТ ДА ПРЫБЫЦЦЯ ГЕАДЭЗІСТАЎ. ТОЛЬКІ НЕ ПАСЛЯ ТАГО, ШТО АДБЫЛОСЯ Ў НАВУКОВЫМ ЦЭНТРЫ.*
КАМУ ЁСЦЬ СПРАВА ДА ГЭТЫХ ГЕАДЭЗІСТАЎ?
У ЧЫМ УВОГУЛЕ СПРАВА?!
СПРАВА Ў ТЫМ, ШТО ФЛЭШ НЕЯК УМУДРЫЎСЯ ПРАЦЯГНУЦЬ ДЗЁЎБАНЫ САМАЛЁТ СКРОЗЬ МОСТ.** ПАКУЛЬ МЫ НЕ ПЕРАКАНАЕМСЯ, ШТО МОСТ НЕ ВЫБУХНЕ НА ТЫСЯЧЫ КАВАЛАЧКАЎ, ВЫ ЗАСТАНЕЦЕСЯ ЎСЕ НА ГЭТЫМ МЕСЦЫ.
МАЕ ДЗЕЦІ НА ІНШЫМ БАКУ!
МНЕ ПРОСТА ТРЭБА ДАДОМУ!
ЯК І МАЕ САБАКІ!
*У ПЕРШЫМ НУМАРЫ ФЛЭШ ВЫКАРЫСТАЎ НЯ ТУЮ ЧАСТАТУ ВІБРАЦЫІ, ПРАХОДЗЯЧЫ СКРОЗЬ АСФАЛЬТ, ЧЫМ ВЫКЛІКАЎ ВЫБУХ.
**У 3-ІМ НУМАРЫ ФЛЭШ ВІБРЫРАВАЎ МАЛЕКУЛАМІ САМАЛЁТА, ЯКІ ПАДАЎ. ДЗЯКУЮЧЫ ГЭТАМУ САМАЛЁТ ПРАЛЯЦЕЎ СКРОЗЬ МОСТ, А НЕ ЎРЭЗАЎСЯ Ў ЯГО.
ВАЎ, МАНУЭЛЬ, ТВАЯ РУКА! ГЭТА ТЛУМАЧЫЦЬ ХУТКАЕ КЛЕТАЧНАЕ АДНАЎЛЕННЕ. БЫЛО БАЛЮЧА?
АГА, АЛЕ НАШМАТ МЕНШ, ЧЫМ КАЛІ ІХ АДСЯКАЮЦЬ.
СПАДЗЯЮСЯ, ТАБЕ ВЕЛЬМІ БАЛЮЧА. ТЫ ПАКІНУЎ ТАМ ПАМІРАЦЬ СВАЙГО ЛЕПШАГА СЯБРА!
ВОЎ.
СЛУХАЙ, ГЭТА НЕ МАЯ ВІНА, ШТО МОСТ ЗАРАЗ ПЕРАКРЫТЫ. НАМ ТРЭБА ЗНАЙСЦІ ІНШЫ ВЫХАД АДСЮЛЬ, ПАКУЛЬ ГЭТЫ НАТОЎП НЯ СТАЎ АГРЭСІЎНЫМ.
І ПАВЕР МНЕ, ДЗЕТКА, ЯНЫ СТАНУЦЬ АГРЭСІЎНЫМІ. Я ТАКОЕ ЎЖО БАЧЫЎ.
МАЁ ІМЯ ПЭЦІ СПІВОТ, АБІЗГАЛ. І Я НЕ ПАКІНУ МОСТ. ПАЛІЦЫІ МОЖА СПАТРЭБІЦЦА ДАПАМОГА. Я НЕ ЎЦЯКУ ПРЫ ПЕРШЫХ НЕБЯСПЕКІ.
Я НЕ БАЯЗЛІЎКА.

Я ТАКСАМА. Я ВЫЖЫВАЮ.
ВЕДАЕШ, У ЧЫМ САПРАЎДНАЯ ПРАБЛЕМА? НАТОЎП. ЯНЫ ХУТКА БУДУЦЬ ТУТ. Я АДЧУВАЮ, ЯК ЯНЫ НАБЛІЖАЮЦЦА.
ТЫ Ж НЕ ЖАДАЕШ ТАКОЙ ДОЛІ, ЯК У БАРЫ. ГЭТА НЕ ТВАЯ ВАЙНА.
ДАВАЙ... ДАВАЙ ВЫБІРАЦЦА АДСЮЛЬ...
НЕ.
Я ЗАСТАЮСЯ ТУТ. ВЫКОНВАЙ СВАЮ ПРАЦУ.
ЯК БАРЫ МОГ ТАК У ТАБЕ ПАМЫЛЯЦЦА?
ЁН ПАЙШОЎ ШУКАЦЬ ЦЯБЕ. ЁН ДЗЕЛЯ «СЯБРА» ПАСТАВІЎ НА КОН СВАЁ ЖЫЦЦЁ... ДАРМА АХВЯРАВАЎ САБОЙ!
З ІМ УСЁ БУДЗЕ ДОБРА. ЯНЫ ВЕДАЮЦЬ, ШТО ЁН ДЛЯ МЯНЕ ЗНАЧЫЦЬ.
ДЫ ТАБЕ НА ЎСІХ НАЧХАЦЬ!
НАЧХАЦЬ НА ЎСІХ, АКРАМЯ СЯБЕ.
ДЫК ЧАМУ Ж ЁН ПАВІНЕН ШТОСЬЦІ ЗНАЧЫЦЬ ДЛЯ НАТОЎПУ?!
БАРЫ ЖАДАЎ, КАБ З ТАБОЙ УСЁ БЫЛО ДОБРА... А ЗАРАЗ ЁН, МАГЧЫМА, ЛЯЖЫЦЬ У ЛУЖЫ СВАЁЙ КРЫВІ. ПАРАЗВАЖАЙ НАД ГЭТЫМ!
АСТРОГ «ЖАЛЕЗНАЯ ВЫШЫНЯ».
«І Ў ЧАРГОВЫМ НЕЧУВАНЫМ АРТЫКУЛЕ АЙРЫС УЭСТ ВЫСВЯТЛЯЕ, ШТО КАПІТАН ХОЛАД ЗМАРОЗІЎ РЭПУТАЦЫЮ ФЛЭША».
АГА, «ФАЙНЫ» ЗАГАЛОВАК ДЛЯ ПЕРАДАВОГА АРТЫКУЛА
...ЗАМЕСТ ТАГО, КАБ ПАЦВЕРДЗІЦЬ СУПЕРБРУТАЛЬНАСЦЬ ФЛЭША, ГЭТЫ ХАЛОДНЫ АШАЛОТАК ЗАМЫКАЕ МЯНЕ ТУТ! І ЎСЁ ГЭТА ПАДЧАС ЗАЦЬМЕННЯ!
ВЫДАТНА. ЦЯПЕР ТЫ ГУТАРЫШ САМА З САБОЙ...
ХММ.



ПРАБАЧ МЯНЕ, БАРЫ...
МНЕ НЯ ТРЭБА БЫЛО ПАКІДАЦЬ ЦЯБЕ.
НЯ ТРЭБА БЫЛО ЗАСТАВАЦЦА Ў БАКУ.
ТРЫМАЙСЯ, БАРЫ, Я ВЯРТАЮСЯ ЗА ТАБОЙ...
GOLD RUSH PAWN SHOP
ВОЎ! КУДЫ Ж МЫ НАКІРОЎВАЕМСЯ, А?
ПРЭЧ З ДАРОГІ!
ЗЛАЗЬ З КАНЯ, ПАКУЛЬ МЫ ЦЯБЕ НЕ СЦЯГНУЛІ.
ГЭТА ПАГРОЗА?!
ТЛУМАЧ, ЯК ПАЖАДАЕШ. АЛЕ МЫ ЗАБІРАЕМ ЦЯБЕ З САБОЙ.
У МЯНЕ НЯМА НА ГЭТА **ЧАСУ**, Я ПАВІНЕН ЗНАЙСЦІ...
БАРЫ? ДАВАЙ МЫ ЗЭКАНОМІМ ТВОЙ ЧАС. ЁН **ПАМЁР**.
ТАКОЕ ЧАСЦЯКОМ АДБЫВАЕЦЦА ВАКОЛ ЦЯБЕ. АЛЕ ПАКОЛЬКІ ТЫ НІДЗЕ ПАДОЎГУ НЕ ЗАТРЫМЛІВАЕШСЯ, КАБ ВЫСВЯТЛЯЦЬ ТАКОЕ... ДАВАЙ МЫ ТАБЕ ПАВЕДАМІМ...
ТЫ НІКОЛІ З ГЭТЫМ НЯ ЗВЫКНЕШСЯ.
БАРЫ...
ВЫ ЗАБІЛІ **БАРЫ**?!



ДЫ Я РАЗАРВУ ВАС УСІХ!
KRAK
THUMP


БАРЫ...
БАРЫ, ЯКОГА ЛЯСУНА ТУТ **АДБЫЛОСЯ?**
МАНУЭЛЬ?
ПАВЕРЫЦЬ НЕ МАГУ, ТЫ **ЖЫВЫ!**
ТЫ Ж МЯНЕ ВЕДАЕШ, Я ЖЫВУЧЫ, НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА ТОЕ, ШТО НАПІСАНА Ў МАІМ НЕКРАЛОЗЕ.
ДАКЛАДНА... МЯРКУЮ, ТРЭБА АДСВЯТКАВАЦЬ ТВАЁ ПАХАВАННЕ.
МІЛЫ ПЯРСЦЁНАК... НАРЭШЦЕ ЗНАЙШОЎ ДЗЯЎЧЫНУ, ЗА ЯКУЮ МОЖНА І ЖЫЦЦЁ АДДАЦЬ?
ЭММ, НЕ... ПРОСТА МАЯ ПРАЦА.
КАЛІ Я КАЗАЎ «ЗНАЙСЦІ **ЗНАЧНАЕ**», Я НЯ МЕЎ НА ЎВАЗЕ ПАДРЫВАЦЬ УСЁ ЎШЧЭНТ. ЗУСІМ НЕ «ПАБАРЫ АЛЕЎНАСКІ»
СТРАШЭННАЕ **БЯЗЛАДДЗЕ**, ТАК? НЯШЧАСНЫ ВЫПАДАК У ЛАБАРАТОРЫІ. ВУХМ, МАЛАНКА І ХІМІКАТЫ, МОЖАШ ТАКОЕ ЎЯВІЦЬ? ДРУЖА, ЯК ЖА Я РАДЫ ЦЯБЕ БАЧЫЦЬ! ТВАЯ МАЦІ БУДЗЕ РАДАЯ ПАЧУЦЬ...
Я НЕ ЗАСТАНУСЯ. МНЕ ТРЭБА СА СВАІМ БАРДАКОМ РАЗАБРАЦЦА.
ТЫ НЕ ЗБІРАЕШСЯ ПАБАЧЫЦЦА З ЁЙ?
ДЛЯ ЯЕ ЛЕПЕЙ БУДЗЕ, КАЛІ ЯНА БУДЗЕ ЛІЧЫЦЬ, ШТО Я ПАМЁР.
ЛЕПЕЙ ДЛЯ ЯЕ? **ЦІ ДЛЯ ЦЯБЕ?**
ЛЕПЕЙ ДЛЯ МАЙГО ПЛАНА – САРВАЦЬ СВАЁ ПАХАВАННЕ?
АЛЕ НЕ ТУРБУЙСЯ, БАРЫ... КАЛІ НЕ АТРЫМАЕШ ЗАПРАШЭННЕ, МОЖАШ ПАВЕСЯЛІЦЦА РАЗАМ СА МНОЙ.
А БОЖУХНА, КАЛІ Я ПРАСЯДЖУ ТУТ ЯШЧЭ ТРОХІ, СОЧАЧЫ ЗА ІХНІМ **«БРАТЭРСКІМ КАХАННЕМ»**...
ПРАЯВІ ПАВАГУ! АЛЕН – ЯК БРАТ.
ДЛЯ ЯГО, МАБЫЦЬ, АЛЕ НЕ ДЛЯ НАС.


ПАКІНЬЦЕ МЯНЕ. ВОЧЫ Б МАЕ ВАС НЯ БАЧЫЛІ!
НЕ ПАДАБАЕЦЦА ТОЕ, ШТО БАЧЫШ? І ХТО Ў ГЭТЫМ ВІНАВАТЫ?
ПА-ВАШАМУ, Я НЯ ВЕДАЮ? Я... Я ДАЗВОЛІЎ ВАМ ЗАБРАЦЬ АДЗІНАЕ, ШТО ТАК ШМАТ ДЛЯ МЯНЕ ЗНАЧЫЛА... КАБ ВАС ЧОРТ УЗЯЎ...
ХТО ТЫ ТАКІ, КАБ СУДЗІЦЬ **НАС**?!
УСЁ, ШТО МЫ ЁСЦЬ... УСЁ, ШТО МЫ РОБІМ... БЯРЭ ПАЧАТАК АД ЦЯБЕ, МАНУЭЛЬ!
ХОПІЦЬ УЦЯКАЦЬ, І ЗІРНІ НА ФАКТЫ. ТЫ НЯ МОЖАШ УЦЯКАЦЬ АД НАС, ТАКСАМА ЯК І АД СЯБЕ.
ТАМУ ШТО МЫ – **ГЭТА** ТЫ.
ЗАБІ ЗЯПУ...
МЫ ЗАБІЛІ БАРЫ, А ГЭТА КАЖА ПРА ТОЕ, ШТО І **ТЫ** ЗДОЛЬНЫ ЗАБІЦЬ ЯГО.
МЫ ВЫЖЫВАЕМ. ВОСЬ ШТО МЫ РОБІМ.
НАМАТАЙ САБЕ НА ВУС. КОЖНЫ З НАС... МЫ ЗРОБІМ УСЁ, ШТО СПАТРЭБІЦЦА. НЯГЛЕДЗЯЧЫ НІ НА ШТО.
НІХТО НАС НЕ СТРЫМАЕ.
НІХТО НЕ ЎСТАНЕ ПАМІЖ **НАМІ**.
ТЫ ПАВІНЕН ПРІНЯЦЬ НАС ТАКІМІ, ЯКІМІ ЁСЦЬ.
ТЫ НЕ ПАВІНЕН УЦЯКАЦЬ. ДОСЫЦЬ.
ПРОСТА, ПРЫМІ ТОЕ, КІМ ТЫ З'ЯЎЛЯЕШСЯ.
АНГХХ – ШТО ЗДАРЫЛАСЯ?


АПОШНЯЕ, ШТО Я ПАМЯТАЮ, Я БЫЎ АБКРУЖАНЫ НАТОЎПАМ. І З НЕВЯЛІКАЙ ДАПАМОГАЙ МЕНТАЛЬНАГА СПІДФОРСА, Я СТАЎ **ФЛЭШАМ** І НАДРАЎ ІМ...
НЕ, СТОП...
КАЛІ Я ГЭТА ЎСЁ ЗРАБІЎ, ТАДЫ ЧАМУ Я ТУТ?
ПРЫГАДВАЙ, БАРЫ. ПАМАТАЙ НАЗАД.
Я ЎСПОМНІЎ... Я ЛЕДЗЬ НЕ АТРЫМАЎ КУЛЮ, АЛЕ ЎКЛЮЧЫЛІСЯ МАЕ ІНСТЫНКТЫ.
НА ШЧАСЦЕ, **СЭНСАРНЫЯ НЕЙРОНЫ** – ДЗІЎНАЯ РЭЧ. ПАД УПЛЫВАМ ВОНКАВЫХ РАЗДРАЖНЯЛЬНІКАЎ ЯНЫ ПАСЫЛАЮЦЬ СІГНАЛЫ Ў ЦЭНТРАЛЬНУЮ НЕРВОВУЮ СІСТЭМУ.
СУПЕРХУТКАСЦЬ ТАКСАМА ДАПАМАГАЕ. МАЁ ЦЕЛА ПАСЫЛАЕ БОЛЕВЫЯ СІГНАЛЫ Ў МОЗГ З ТАКОЙ ХУТКАСЦЮ, ШТО Ў ТУЮ Ж **ФЕМТАСЕКУНДУ**, КАЛІ Я ШТОСЬЦІ АДЧУЮ, Я АДРАЗУ Ж ЗРЭАГУЮ.
Я МАГУ АДЧУВАЦЬ НАЙМЕНШЫЯ ЗМЕНЫ Ў ЦІСКУ ПАВЕТРА ВАКОЛ САБЕ... ШТО РОБІЦЬ МЯНЕ АМАЛЬ **НЕПАРАЖАЛЬНЫМ**.
ПРАЎДУ КАЖУЧЫ, ДА ГЭТАГА АМАЛЬ НІКОЛІ НЕ ДАХОДЗІЦЬ, ТАМУ ШТО НАВАТ КУЛЯ, ЯКАЯ ЛЯЦІЦЬ У МЯНЕ, НЕ НАСТОЛЬКІ ХУТКАЯ, КАБ ЗАСПЕЦЬ МЯНЕ ЗНЯНАЦКУ.
АЛЕ ГЭТА НЕ МЯНЯЕ ТАГО ФАКТА, ШТО Я НЕ МАГУ КАНТРАЛЯВАЦЬ СВАЕ МЕНТАЛЬНЫЯ ЗДОЛЬНАСЦІ... З-ЗА ГЭТАГА Я ЛЕДЗЬ НЕ **ПАМЁР**.
Я ЗАНАДТА ЗАДУМАЎСЯ. Я ЗАБЛУДЗІЎ У **ІМАВЕРНАСЦЯХ**. Я НЯ ЗМОГ АДРОЗНІЦЬ ТОЕ, ШТО Я **ЗРАБІЎ**, АД ТАГО, ШТО Я **ЗБІРАЮСЯ** ЗРАБІЦЬ.
Я ЗАВІСНУЎ.


СЁННЯ МОЙ МОЗГ ПАДВЁЎ МЯНЕ. АЛЕ ІНСТЫНКТЫ ЎРАТАВАЛІ МНЕ ЖЫЦЦЁ.
ТАК... МНЕ ЗНАЁМЫ ГЭТЫ ГАЛЬШТУК...
ДОКТАР ЭЛІАС?
ЯНЫ ЯГО ЗАХАПІЛІ?
ВО, ЦУДОЎНА...
ВЕДАЕЦЕ ШТО? ХОПІЦЬ УЖО АНАЛІЗАВАЦЬ
НАТОЎП НА ЭЛІАСЕ НЯ СПЫНІЦЦА... МАНУЭЛЬ І ПЭЦІ ЎСЁ ЯШЧЭ Ў НЕБЯСПЕЦЫ.
Я САМЫ ХУТКІ ЧАЛАВЕК У СВЕЦЕ, Я НЕ ДАЗОЛЮ, КАБ З ІМІ ШТОСЬЦІ ЗДАРЫЛАСЯ.
НІКОЛІ.
KKRRAASSH

ДОСЫЦЬ УЖО ЗАДУМВАЦЦА. УСЁ САПРАЎДЫ ПРОСТА.
Я ПАВІНЕН БЕГ-ЧЫ НАСУСТРАЧ НЕБЯСПЕКІ.
ГЭТА МАЯ ПРАЦА - АБАРАНЯЦЬ ГЕМ-СІЦІЗ.
АБАРАНЯЦЬ МАІХ СЯБРОЎ.
НЕЗАЛЕЖ-НА АД КОШТУ, ЯКІ МНЕ ТРЭБА ЗАПЛАЦІЦЬ.
Я НЕ СПЫНЮСЯ.
Я ФЛЭШ...



ВОСЬ, ЧЫМ Я ЗАЙМАЮСЯ.
BOOM
NEXT: ЛЁС НАТОЎПУ!
THE FATE OF MOB RULE!